# Распараджэнне
# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

9 ліпеня 2021 г. № 148рп г.Мінск

Аб падтрымцы культуры і мастацтва

1. Зацвердзіць рашэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва (дадаецца).

2. Міністэрству культуры выдзеліць у 2021 годзе са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва 1 667 170,04 рубля на ажыццяўленне выплат у адпаведнасці з рашэннем, указаным у пункце 1 дадзенага распараджэння.

3. Кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў, выдзеленых згодна з пунктам 2 дадзенага распараджэння, ускласці на Камітэт дзяржаўнага кантролю і Міністэрства культуры.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 • Для правовых актов

10

ЗАЦВЕРДЖАНА

Распараджэнне Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
09.07.2021 № 148рп

РАШЭННЕ

савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

11 сакавіка 2021 г. пратакол № 1 г.Мінск

Выдзеліць:

па хадайніцтве Брэсцкага аблвыканкама Драгічынскаму райвыканкаму на першачарговыя рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы на аб’екце ”Сядзібна-паркавы ансамбль у в.Закозель Драгічынскага раёна. Рэстаўрацыя капліцы“ за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 300 000 рублёў;

па хадайніцтве Віцебскага аблвыканкама Лепельскаму райвыканкаму на правядзенне работ на аб’екце ”Рэстаўрацыя помніка архітэктуры XIX стагоддзя пад краязнаўчы музей (памяшканне былога вінаачышчальнага склада) па вул.Савецкай у г.Лепелі“ за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 524 992,71 рубля;

па хадайніцтве Гродзенскага аблвыканкама:

Ашмянскаму райвыканкаму на кансервацыю з фрагментарнай рэстаўрацыяй і выкарыстаннем руін былога замка Сапегі з фрагментамі абарончых збудаванняў у аграгарадку Гальшаны Ашмянскага раёна за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 350 000 рублёў;

Смаргонскаму райвыканкаму на рэканструкцыю з рэстаўрацыяй былога будынка стайні ансамбля былога палаца Агінскіх за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 229 677,33 рубля;

дзяржаўнай установе ”Нацыянальная бібліятэка Беларусі“ на набыццё друкаваных кніжных помнікаў:

за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 235 218,96 рубля;

за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных

каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 27 281,04 рубля.

Старшыня савета фонду Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь па падтрымцы
культуры і мастацтва Н.У.Шарубіна